У 1991 г. за апавяданне «Пеля» атрымаў першую прэмію на Усесаюзным літаратурным конкурсе «Молодые дарования». Лаўрэат прэміі тыднёвіка «Літаратура і мастацтва» за апавяданне «Бляха» (1992) і літаратурнай прэміі імя Івана Мележа за кнігу прозы «Смута» (1995).

У творах Андрэя Федарэнкі, насычаных складанай сацыяльнай праблематыкай, багата прадстаўлены наш палескі пейзаж, пра што сведчыць і ўрывак з ягонага апавядання «Пеля».

Стаяла ноч.

Час ад часу я ўсхопліваўся, хапаў палку, кідаўся то ў адзін бок, то ў другі. Палка лезла ў прорву. Твар распух ад камароў; ад іхняга звону, ад густога балотнага паху, ад укусаў п'явак і ад нерваў у мяне кружылася галава. Чужым, сіпатым голасам я пачаў гаварыць да балота:

— Ты хочаш, каб я тут здох… Але я выжыву, мне проста смешна!.. Я ж усё роўна за гэтую ноч не змянюся, ніяк яна на мне не адаб'ецца… Ты папсуеш матцы здароўя за гэтую ноч, паламаеш мне лета — вось і ўсё, самае большае… Нават і лета не паламаеш — я знайду занятак, хоць платы параблю! І я плюю на цябе, смурод, гадзючнік,— мала вас паасушалі!.. У мяне яшчэ ўсё наперадзе, я ўбачу новыя гарады, новае жыццё,— я буду жыць, а ты — смярдзець тут, зарастаць, пакуль не высахнеш к чорту!..

У адказ мне толькі звінела, чмокала, булькала, і калыхаўся такі густы туман, што яго відаць было нават у цемры.

Раніца надышла надзіва хутка. Ужо ў сярэдзіне ночы без сонца пачало святлець, паменела камароў, зашчабятала птушка. Я змог разглядзець ваду, свае ногі, кусты. Пасярод пелі плавала вудка, ад якой разбіваліся дробныя хвалі — карась тармасіў… Здранцвелымі нагамі, паўз саменькую ваду, каля ямкі, якая ўчора ледзь не стала маёй магілаю, я выбраўся на свой учарашні след і хутка быў ужо на сухім беразе. На пелю мне не хацелася нават азірацца…

Цяпер, праз пэўны час, ужо не сорамна ўспамінаць, як каля самай сваёй хаты ўмудрыўся заблудзіцца і ледзь ацалеў. Але і не смешна. Пажыў я за гэтыя гады «новым жыццём», пабачыў новыя гарады, нават у Крым з'ездзіў. А згадваюцца чамусьці не інтэрнатаўскія пракураныя скразнякі, не аднастайныя, на ноч, бязрадасныя п'янкі, не блуканні па чужых кватэрах, калі баішся прызнавацца гаспадарам, якія баяцца радыяцыі, што родам — з Гомельскай вобласці… Пеля згадваецца.

Можна сказаць — ну і што, дужа нам цікавая твая настальгія па нейкіх балотах.

А я скажу: тым летам атрад наш быў расфарміраваны, бо на другі дзень па прыездзе, у Крыму, аўтобус, які вёз студэнтаў на вінаграднік, урэзаўся ў скалу. Адзін чалавек загінуў і два асталіся калекамі. Мог я сярод іх апынуцца? І калі гэта выпадковасць, дык што ж тады — наканаванне?

Радзіма мая — вёска, балота… Няўжо і цяпер я яшчэ нешта значу для цябе, няўжо і цяпер ты абараняеш мяне ад нечага? Нашто ж ты ўсё часцей і часцей прыходзіш у думкі, ва ўспаміны, у сны, і так упарта, кожнай травінкаю з пасохлых пеляў — не адпускаеш?..

## Героі і ахвяры

І ў мірны час здалёку і зблізку прыходзіла ў нашы хаты вялікае гора. Тут, на Палессі, не рваліся бомбы і снарады, не стракаталі аўтаматы і кулямёты, але недзе, за многія тысячы кіламетраў…

Па рашэнні ЦК КПСС і Савецкага ўрада ў канцы 1979 г. на тэрыторыю Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан былі ўведзены савецкія войскі. Гісторыя дасць канчатковую ацэнку афганскай вайне, але, якою б ні была гэтая ацэнка, ніколі не забудуцца гераічныя подзвігі нашых воінаў у далёкай краіне. Учарашнія вучні, студэнты, рабочыя і калгаснікі цаною ўласнага жыцця ратавалі сваіх сяброў, верныя салдацкай клятве, праяўлялі непахісную сілу волі і духу. Не ўсе вярнуліся з той вайны. Васьмярых сваіх юнакоў не дачакалася і Мазыршчына.

Звыш 200 воінаў-афганцаў жыве цяпер у горадзе і раёне. Большасць з іх добрасумленныя працаўнікі, паважаныя людзі. Яны памятаюць сваю баявую маладосць, не забываюць загінуўшых сяброў.

Не забудзе Мазыршчына і тых, хто ў розныя пасляваенныя гады загінуў пры выкананні службовых абавязкаў у радах Савецкай Арміі і Ваенна-марскога флоту. Помнім мы і адважных мі-

ліцыянераў, што ахвяравалі сабою ў смяротных схватках са злачынцамі. І ніколі не забудзем чарнобыльскіх ліквідатараў, якія не шкадавалі свайго жыцця, каб утаймаваць мірны атам.

## Не вярнуліся з Афганістана

**Белашыцкі Васіль Мікалаевіч** (н. 4.10.1962 г. у в. Шугалеі Лельчыцкага р-на). У 1978 г. скончыў васьмігадовую школу, вучыўся ў прафесійна-тэхнічным вучылішчы. У лістападзе 1983 г. прызваны ў Савецкую Армію. Малодшы сяржант В. М. Белашыцкі загінуў 16.10.1984 г. пры выкананні службовага абавязку. Пахаваны на могілках у Мазыры. Узнагароджаны пасмяротна ордэнам Чырвонай Зоркі.

**З пісьмаў В. М. Белашыцкага родным**

*5 чэрвеня 1984 г.*

...Много ездим, воюем. У нас, короче, все как на войне, вот только «немцы» другие, да воевать с ними труднее: в горах с ними очень тяжело воевать.

У нас очень много здесь овощей и фруктов: дыни, арбузы, помидоры, абрикосы и всякая всячина.

*3 кастрычніка 1984 г.*

...Трудно очень писать, но что делать. Телеграмму вашу получил. Командир сразу же подписал приказ на отпуск, но высшее начальство не отпускает. Так как телеграмма не была заверена в райвоенкомате и райбольнице... Мама, крепитесь и не убивайтесь... Горе всегда тяжелое, смотрите себя. Ведь вам еще ждать своего сына из Афганистана. У меня все хорошо. Потихоньку воюем. Завтра недели на две уходим на операцию.

*Ліст напісаны пасля атрымання весткі пра смерць бацькі М. К. Белашыцкага.*



В. М. Белашыцкі



У. А. Бобр

**Бобр Уладзімір Аркадзьевіч** (н. 14.3.1949 г. у в. Бабры). Скончыў Мазырскае медыцынскае вучылішча і працаваў фельчарам Мялешкавіцкай участковай бальніцы. У 1968 г. прызваны ў Савецкую Армію, застаўся на звыштэрміновую службу. Восенню 1982 г. добраахвотнікам пайшоў служыць у Афганістан санінструктарам. 22.4.1984 г. прапаршчык У. А. Бобр быў цяжка паранены ў час нападу душманаў.

Памёр у Ташкенце 28.4.1984 г. Пахаваны ў в. Бабры. Узнагароджаны медалямі «За службу Радзіме», «60 год Узброеных сіл СССР».

**Вяракса Уладзіслаў Антонавіч** (н. 29.12.1967 г. у Мазыры). У 1983 г. скончыў 8 класаў сярэдняй школы № 5, Мазырскае ПТВ № 68. Працаваў у Мазырскім вытворчым мэблевым аб'яднанні. У лістападзе 1986 г. прызваны ў Савецкую Армію, з мая 1987 г. служыў у Афганістане. Радавы У. А. Вяракса загінуў 30.10.1988 г. Пахаваны ў в. Дразды. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна), медалямі «За адвагу» і іншымі.

**З пісьма камандзіра часці бацькам У. А. Вяраксы**

*25 лістапада 1989 г.*

...Это случилось в 9 час. 30 мин. Ваш сын находился в составе боевой колонны,следовавшей по маршруту Гульбахар — Джабальус — Сирадж. В районе населенного пункта Намазджан колонна была обстрелена мятежниками из стрелкового оружия и гранатометами. Одна из гранат попала в кормовую дверь боевой машины, где находятся топливные баки. В результате сильного взрыва Владислав погиб.

За время прохождения службы в нашей части зарекомендовал себя с положительной стороны как дисциплинированный, инициативный, грамотный солдат. Он всегда мужественно переносил все тяготы и лишения воинской службы.



У. А. Вяракса



А. М. Дубень



А. М. Мельнічэнка

Вы можете гордиться своим сыном — верным защитником нашей Родины, не дрогнувшим перед лицом опасности и до конца выполнившим свой долг.

**Дубень Аляксандр Міхайлавіч** (н. 18.2.1964 г. у в. Летавішча). Скончыў 8 класаў Асавецкай сярэдняй школы, вучыўся ў Мінскім ПТВ № 34 чыгуначнікаў. Працаваў у Светлагорску.

Радавы А. М. Дубень загінуў 19.3. 1984 г. у час абароны аэрадрома. Пахаваны ў в. Асавец Мазырскага раёна.

**Мельнічэнка Анатоль Міхайлавіч** (н. 11.10.1955 г. у в. Малы Бокаў). Скончыў Міхалкаўскую сярэднюю школу, затым Чарнігаўскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў. Служыў у Афганістане. Штурман верталётнай эскадрыллі старшы лейтэнант А. М. Мельнічэнка загінуў 25.10. 1983 г. Пахаваны ў в. Малы Бокаў. Вуліца, дзе знаходзіцца дом бацькоў адважнага лётчыка, носіць яго імя. На будынку школы, дзе вучыўся Анатоль Міхайлавіч, устаноўлена мемарыяльная дошка.

**З пісьма С. Е. Гафштэйна, настаўніка-метадыста Міхалкаўскай СШ**

Эти строки не только дань уважения павшему в бою воину. Анатолий действительно был таким: целеустремленным, волевым, настойчивым, скромным, милым пареньком, очень красивым юношей и в то же время уже мужчиной с волевым и мужественным лицом.

Нас, учителей, поражали его работоспособность, его добросовестное отношение к порученному делу, которые он унаследовал от своей матери Ольги Александровны Мельниченко, замечательной труженицы совхоза «Мозырский». Он все делал на совесть. И совесть, порядочность были, пожалуй, главными чертами его характера.

За годы работы в школе я видел много разных учеников: ленивых и трудолюбивых, настойчивых и безвольных, целеустремленных и таких, которые вообще не знали, что они намерены делать после школы. Такого, как он, другого я не помню. У него была одна мечта — небо. Ей он подчинил весь свой распорядок дня. Он любил физический труд и физическую культуру, но в равной степени уделял внимание всем предметам. Учился он прекрасно. Не помню случая, чтобы он пришел на урок неподготовленным.

Вежливый, всегда уравновешенный, рыцарь по отношению к девушкам — таким он запомнился нам всем.

Он был нашим общим любимцем, нашей гордостью.

Он любил жизнь, любил свое небо, был прекрасным сыном, мужем, отцом своим детям, горячо любил Родину.

Таким он навсегда остался в памяти его учителей.

**Семяненка Уладзімір Васілевіч** (н. 28.11.1964 г. у г. Томск). У1981 г. скончыў сярэднюю школу № 11 у Мазыры, у 1983 г.— Полацкі палітэхнікум. У тым жа годзе прызваны ў Савецкую Армію, з кастрычніка 1983 г. служыў у Афганістане.

Радавы У. В. Семяненка загінуў 18.6.1984 г. Пахаваны ў Мазыры. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

**З пісьма Уладзіміра Семяненкі бацьку**

Здравствуй, папа!

Вот пишу тебе еще одно письмо. Дела идут нормально. Чего я только не насмотрелся за эти



У. В. Семяненка



С. У. Сіліч

І. В. Сніцарэнка



3 месяца, которые я здесь. 15 дней были на операции — прочесывали кишлаки. В этой операции много погибло человек, в нашей роте тоже есть потери. В одном ауле брали «духов», сильный был бой. Брали целый день почти — не могли живыми взять, потом расстреляли из гранатометов.

Да, досталась мне служба, но я не променял бы ее сейчас на службу в Союзе. Тут по-настоящему поймешь жизнь, Родину — ты не подумай, это не громкие слова.

Вот завтра опять уезжаем куда-то. Главное, за меня не беспокойтесь, все будет нормально.

Папа, я прошу тебя, как прочитаешь письмо, сразу сожги его, не дай бог оно попадет к маме или Наташе.

До встречи, Вова.

**Сіліч Сяргей Уладзіміравіч** (н. 18.2.1968 г. у в. Касцюковічы). У 1983 г. скончыў Майсееўскую васьмігадовую школу, Мазырскае ПТВ № 68 будаўнікоў. З 1987 г. служыў у Афганістане. Радавы С. У. Сіліч загінуў 8.9.1987 г. пры выратаванні ваеннай тэхнікі. Пахаваны ў в. Касцюковічы. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. На будынку Майсееўскай школы ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

**З пісьма С. У. Сіліча родным**

*8 лютага 1987 г.*

...Дела у меня идут хорошо. Вы говорите, что еще долго ждать, так это не так. Служить мне осталось всего лишь год. А год этот пролетит незаметно. Вы только не волнуйтесь. Все будет хорошо, ведь здесь много таких же парней, как и я, служат, а их тоже ждут матери, отцы, братья, сестры. Так что вы только не переживайте и ждите. Я обязательно вернусь к вам...

**Сніцарэнка Іван Васілевіч** (н. 21.12.1959 г. у Мазыры). У 1974 г. скончыў 8 класаў мазырскай сярэдняй школы № 4, у 1978 г. — Нараўлянскае ПТВ № 117. У лістападзе 1978 г. прызваны ў Савецкую Армію, з 1980 г. служыў у Афганістане.

Радавы І. В. Сніцарэнка загінуў 1.3.1980 г. Пахаваны ў Мазыры. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

**З пісьма І. В. Сніцарэнкі родным**

*14 студзеня 1980 г.*

Здравствуйте, дорогие родные мама, сестра Мария и Володя!

Начинаю свое письмо с того, что я уезжаю в командировку на длительное время. Если от меня не будет долго письма — не переживайте, со мной будет все хорошо. Письма на Слуцк больше не пишите, завтра утром я уезжаю. Высылаю вам все фотографии...

**З пісьма намесніка камандзіра батальёна маці І. В. Сніцарэнкі**

В нашей памяти Ваня всегда был и останется живым героем. Мы продолжаем его подвиги. Батальон добился звания отличного подразделения. Многие воины удостоены высоких правительственных наград... Пишите нам всегда, что Вас интересует. Заботы Ваши — это и наши заботы, горе Ваше — и наше горе. Прасковья Терентьевна, мы Вас очень хорошо понимаем...

## Тут шануюць іх памяць

У ПТВ № 68 створаны музей воінаў-інтэрнацыяналістаў. Пачынаецца ён з карты Афганістана, на якой адзначаны баявы шлях нашых воінаў. На стэндах — асабістыя рэчы, дакументы, узнагароды загінуўшых — Сяргея Сіліча, Івана Сніцарэнкі, Уладзіслава Вяраксы і іншых воінаў. За што яны аддалі свае маладыя жыцці, за якія ідэалы — хто з экскурсаводаў можа сёння растлумачыць гэта?..

На стэндах — здымкі загінуўшых воінаў-мазыран: Анатоля Мельнічэнкі, Ігара Патапчука, Уладзіміра Бабра, Аляксандра Дубеня, Уладзіміра Семяненкі.

Памяць аб загінуўшых захоўваюць іх баявыя сябры, якія прайшлі вогненнымі дарогамі Афганістана. У музеі праводзяцца сустрэчы моладзі з ветэранамі, з бацькамі загінуўшых герояў. Памяць пра ахвяры далёкай, чужой вайны жыве...

*Т. Пілiпчук*

РЭКВІЕМ

З краіны афганскай вярнуліся ў цынку —
Не суджаны быў ім шчаслівы працяг.
Сівее матуля няўцешная: «Сынку!..»
І бацьку пячэ невыносна ў грудзях.

За светам забітыя іх летуценні
Навекі засыпалі родным пяском.
Блукаюць між намі іх светлыя цені
З хлапечым над верхняй губою пушком.

Іх бардамі мужнасць герояў апета,
І чуецца ў песні бравурны трубач.
А ці ж на жалобу накладзена вета? —
Аплач жа, зямля мая, хлопцаў, аплач.

Згадаюць сябры, не забудзе нявеста.
І скрозь, дзе яны дарагімі былі,
О маці-зямля! Ад Чукоткі да Брэста
Слязамі дажджоў іх магілы палі.

Хай слёзы твае нам сумленне апаляць,
Бо ці ж перад імі няма ў нас віны?
Няхай зберажэ наша горкая памяць
Абраннікаў гэткай нянашай вайны.

*Мікола Кусянкоў*

## Мазыране, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў у радах Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту

**АЛІКЕВІЧ Генадзь Велюсавіч,** н. у 1972 у в. Шчакатава, прапаршчык, загінуў 19.11.1992.

**АРЦЮШЭНКА Іван Васілевіч,** н. у 1951 у в. Майская, рад., памёр 10.5.1970.

**БАРАНОЎСКІ Аляксандр Уладзіміравіч,** н. у 1961, сяржант, загінуў 29.5.1981.

**БАРЫСЕНКА Аляксандр Фёдаравіч,** н. у 1962 у г. Мазыр, рад., загінуў 5.5.1982.

**БАТУРЭВІЧ Аляксандр Фёдаравіч,** н. у 1957, мал. сяржант, загінуў 27.2.1976.

**БЕЗВУГЛЯК Віктар Міхайлавіч,** н. у 1961 у г. Мазыр, рад., памёр 15.4.1981.

**БОБР Аляксандр Сяргеевіч,** н. у 1968 у в. Козенкі, ст. матрос, загінуў 1.4.1988.

**ГАРБАТОЎСКІ Міхаіл Адамавіч,** н. у 1934, рад., загінуў 9.3.1956.

**ГЕРАСІМОВІЧ Віктар Мацвеевіч,** н. у 1927 у в. Гіневічаў Груд, рад., загінуў у 1950.

**ГЛЮЗ Анатоль Уладзіміравіч,** н. у 1967 у в. Стараселле, матрос Паўночнага флоту, загінуў 7.3.1985.

### З характарыстыкі камандзіра вайсковай часці

Матрос Анатоль Глюз служыў шафёрам БТР у дэсантна-штурмавой роце марской пяхоты Чырванасцяжнага Паўночнага флоту.

Таварышы па службе ведалі яго як дысцыплінаванага, добрасумленнага матроса. Ён карыстаўся заслужаным аўтарытэтам у камандзіраў і таварышаў па службе, заўсёды выдатна выконваў свае абавязкі.

Служба Анатоля праходзіла ў складаных умовах далёкай Поўначы, дзе немагчыма без вайсковага таварыства і сапраўднай флоцкай дружбы паспяхова выконваць абавязкі па абароне Радзімы. 7 сакавіка 1985 года пры выкананні службовых абавязкаў, ратуючы сябра, Анатоль трагічна загінуў...

**ДАШКЕВІЧ Генадзь Антонавіч,** н. у 1952 у в. Лешня, прапаршчык, загінуў 2.11.1977.

**ДЗЕМІДОВІЧ Іван Фёдаравіч,** н. у 1944,



А. У. Бараноўскі



А. У. Глюз



С. Д. Дзяцел



М. Г. Казак



А. М. Корнеў



М. Я. Літвінчук

рад., загінуў 18.12.1964, пахаваны ў г. Будапешт, Венгрыя.

**ДЗЯЦЕЛ Сяргей Дзмітрыевіч,** н. у 1932 у в. Лешня, мал. сяржант, загінуў на вайсковых вучэннях 27.9.1953 у Грузіі.

**ЕЎЖЫК Іван Дзмітрыевіч,** н. у 1949 у в. М. Зімовішчы, рад., загінуў у 1971.

**ЖДАНАЎ Анатоль Дзмітрыевіч,** н. у 1945, прапаршчык, загінуў 2.7.1987.

**ЖУРАЎСКІ Уладзімір Мікалаевіч,** н. у 1970 у г. Мазыр, рад., загінуў 30.11.1989 у Нагорным Карабаху.

**ЗАДВОРСКІ Уладзімір Якімавіч,** н. у 1926 у в. Міхалкі, рад., памёр 8.7.1950.

**КАДОЛ Міхаіл Іванавіч,** н. у 1957 у г. Мазыр, прапаршчык, загінуў 25.10.1991.

**КАДОЛ Уладзімір Сцяпанавіч,** н. у 1936 у в. Васькаўка, рад., загінуў 11.7.1956.

**КАЗАК Мікалай Гаўрылавіч,** н. у 1940, рад., загінуў 21.8.1962.

**КАНАВОД Аляксандр Іванавіч,** н. у 1958, рад., загінуў 21.9.1977.

**КАНОПЛІЧ Васіль Фёдаравіч,** н. у 1957 у в. Дзербінка, рад., загінуў 11.10.1976.

**КАНОПЛІЧ Міхаіл Кузьміч,** н. у 1948 у в. Махнавічы, прапаршчык, загінуў у 1970 у Германіі.

**КАРЖЭЎСКІ Уладзімір Міхайлавіч,** н. у 1955 у в. Скрыгалаў, рад., загінуў у 1974.

**КЕБЕЦ Уладзімір Міхайлавіч,** н. у 1937, рад., загінуў 22.8.1960 у г. Смаленск.

**КІРЫЧЭНКА Ігар Уладзіміравіч,** н. у 1965 у г. Мазыр, рад., загінуў 4.3.1985.

**КІРЭЕЎ Віктар Сцяпанавіч,** н. у 1945, капітан, памёр 5.4.1973.

**КОРНЕЎ Аркадзь Мікалаевіч,** н. у 1946, палкоўнік, загінуў 16.10.1987, пахаваны ў г. Мазыр.

**ЛАЎШУК Сяргей Уладзіміравіч,** н. у 1964 у г. Мазыр, рад., загінуў 5.8.1984 у Германіі.

**ЛІС Сафія Аляксееўна,** н. у 1955 у в. Барыскавічы, рад., памерла 21.10.1977.

**ЛІТВІНЧУК Міхаіл Якаўлевіч,** н. у 1931 у в. Заводны Востраў, яфрэйтар, загінуў 26.10. 1956 у Венгрыі.

**МАЗУРКЕВІЧ Міхаіл Сцяпанавіч,** н. у 1959 у в. Слабада, рад., загінуў 29.7.1980.

**МАЙСТРОВІЧ Аляксандр Сцяпанавіч,** н. у 1962 у в. Гурыны, рад., загінуў 19.9.1982.

**МАШКОЎСКІ Уладзімір Мікалаевіч,** н. у 1954 у в. Нагорныя, рад., загінуў 15.7.1973.

**МЕЛЕХАЎ Якаў Мікалаевіч,** н. у 1950, рад., памёр 8.1.1970.

**МІШЧАГІН Уладзімір Анатольевіч,** н. у 1972 у в. Бабраняты, рад., загінуў 9.3.1992.

**МУРАШКА Уладзімір Мікалаевіч,** н. у 1953, прапаршчык, памёр 7.11.1993.

**НАВУМЕНКА Сяргей Мікалаевіч,** н. у 1969 у в. Надаткі, сяржант, загінуў 19.9.1988.

**НЯХАЙ Васіль Уладзіміравіч,** н. у 1955, сяржант, загінуў 9.4.1975.

**ПАНГЛІШ Віктар Пятровіч,** н. у 1932 у в. Барбароў, рад., загінуў 31.10.1951 у г. Гусеў Калінінградскай вобл.

**ПАРХОМЕНКА Сяргей Васілевіч,** н. у 1965, рад., загінуў 4.7.1985 у Германіі.

**ПАТАПЧУК Ігар Андрэевіч,** н. у 1950, ст. лейтэнант, ваяваў у Афганістане, цяжка паранены, загінуў у чэрвені 1988.